View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

І.М. Гоўзіч (Мінск)

# ЭВАЛЮЦЫЯ ІНДЫВІДУАЛЬНГАГА СТЫЛЮ ЯНКІ СІПАКОВА Ў КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКІХ ПОШУКАЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ПАКАЛЕННЯ

Філалагічнае пакаленне – пакаленне канца 50–60-х гг. ХХ стагоддзя, пасляваеннае, шасцідзесятнікаў, пакаленне няспраўджаных надзей, расчараваных рамантыкаў, якое не змагло (па гарамадска-гістарычных прычынах) да канца самарэалізавацца, засталося «на ростанях» са сваёй рамантычнай праўдай. У рускай літаратуры – гэта Роберт Раждзесцвенскі, Андрэй Вазнясенскі, Яўген Еўтушэнка, Яўген Вінакураў і інш. У беларускай – А. Вярцінскі, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, П. Макаль, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, І. Пташнікаў, В. Адамчык, Б. Сачанка ды другія.

«Вайна наклала глыбокі адбітак на нашу псіхалогію, на наша светаадчуванне, вызначыла ў значнай ступені нашу маральна-філасофскую арыентацыю (вядома, не толькі ў негатыўным, але і ў станоўчым сэнсе, у сэнсе нашай большай жыццястойкасці, больш устойлівага аптымізму) … мы, жывыя сведкі вайны, не маем маральнага права маўчаць» [4, с. 254], – адзначыў у адказе на пытанні анкеты часопіса «Маладосць» да 30-годдзя з Дня Перамогі Анатоль Вярцінскі. Гэтыя радкі – «Не маем маральнага права маўчаць» – можна ўзяць эпіграфам да ўсёй творчасці пасляваеннага пакалення. Менавіта таму ёсць у іх паэзіі і прозе тое, што дае нам права гаварыць пра яе як з’яву цэласную і непадзельную, – бескампраміснасць, грамадзянская страснасць, непрымірымасць да зла і раўнадушша, нежаданне здраджваць гуманістычным ідэалам, вера ў будучыню. Усё адзначанае настройвала прадстаўнікоў філалагічнага пакалення на высокі адычны лад, надавала іх творам рамантычную афарбоўку і было выклікана тым, што, як сцвярджае М. Арочка, «агульны працэс лірызацыі «сацыяльнай паэзіі», яе эвалюцыя ў бок усё большай шчырасці, душэўнага даверу …» [2, с. 165] на той час была заканамернай. У другім выпадку адычны настрой перабіваўся элегічным, на змену строгай радасці і балючай нянавісці прыходзіла сентыменталісцкае замілаванне роднымі краявідамі, іх яркімі фарбамі і малюнкамі. Аднак усё роўна ў творчасці названых паэтаў на першым месцы аказвалася асэнсаванне асабістай далучанасці да лёсу народа і Радзімы, праўдзівая ацэнка ваенных падзей, а таксама (па словах А. Вярцінскага) «неабходнасць гаварыць пра сябе, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пра час, і пра час – як пра сябе, гарэць у вершах усёй сваёй чалавечай сутнасцю» [4, с. 265]. Творчасць паэтаў-шасцідзесятнікаў прасвечана наскрозь барацьбой з фальшам і маной – ад дзяржаўнай да асабістай, якая стала галоўным ворагам 60-х, таму вектар грамадскай свядомасці ў іх пачатку быў накіраваны ў будучыню, а ў канцы дзесяцігоддзя – у мінулае, што заканамерна прывяло да міфатворчасці, а сімвал дарогі быў і застаецца ключавым тэрмінам, бо «адной з важных стылявых дамінантаў 60-х была ідэя руху» [3, с. 251]. Але прадстаўнікі філалагічнага пакалення арыентаваліся ў сваёй творчасці не толькі на фальклор, але і, як трапна заўважыў М. Тычына, «на нацыянальную і сусветную класіку, маўкліва абмінаючы вопыт савецкай літаратуры, хоць і не ігнаруючы яго цалкам» [5, с. 197], актыўна спрыялі ўключэнню беларускай літаратуры ў еўрапейскі культурна-гістарычны кантэкст.

З поўным правам можна гаварыць пра жанрава-стылявую сістэму творчасці паэтаў пасляваеннага пакалення як з'яву цэласную, замкнёную вобразамі-сімваламі «вера», «вернасць», «давер», узрослую на глебе непрымірымасці да ўсяго, што супрацьстаіць ім, з выразнымі грамадскімі крытэрыямі, з грамадзянскай бескампраміснасцю. Усё астатняе ў гэтай «стылявой цэласнасці» – вытворнае: грамадзянская «экзальтацыя», адычны і элегічна-баладны «жанравыя настроі», павышаная эмацыйнасць, што ўплывае на выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці, на паэтычны сінтаксіс («неспакойны», «узрушаны»), і жаданне выказацца на поўны голас, прайсці па зямлі «на поўны рост», настроенасць на размову ад імя народа, пакалення, грамады ў цэлым. Гэтую сістэму гарманізуюць, цэментуюць выразна акрэсленыя крытэрыі дабра і справядлівасці.

Адзінства і знешняя першапачатковая замкнёнасць стылявой сістэмы паэзіі шасцідзесятнікаў грунтуецца на арыгінальнасці і самабытнасці пошукаў кожнай творчай індывідуальнасці, гэта замкнёнасць агульнага на аснове арганічнага спалучэння індывідуальнага. Істотная асаблівасць лірыкі прадстаўнікоў філалагічнага пакалення заключалася яшчэ, на нашу думку, у тым, што кожны аўтар прайшоў значную эвалюцыю ў сваёй творчасці, як і іх славутыя папярэднікі. Аднак маладзейшыя аўтары стаялі больш трывала на пазіцыях сацыяльна значнага мастацтва з выразна выяўленай індывідуальнай суб'ектыўнасцю і настроенасцю на адкрытую грамадзянскасць і рамантычную хвалю. Паэты-пасляваенцы, у адрозненне ад сваіх папярэднікаў XIX і першай паловы XX стагоддзяў, знайшлі шлях

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да паяднання «дзяржаўнага» і «пазадзяржаўнага» (Г. Гачаў), адчуўшы адзінства свайго і агульнанароднага клопату, максімальна наблізіліся да спрадвечнага гуманістычнага разумення крытэрыяў сацыяльнай і маральнай праўды і справядлівасці. Яны засведчылі працяг даўніх традыцый грамадзянскай беларускай лірыкі на новым узроўні. Вядома, у 80 – 90-я гады XX стагоддзя абставіны памяняліся, і чытачы, і самі мастакі ўбачылі адрозненне паміж сапраўдным і ўяўна народным светаўспрыманнем, навязаным зверху, дэклараваным каманднa-адміністратыўнай сістэмай. Але раней, у 50 – 60-я гады, усе паэты былі шчырыя ў сваёй веры, спадзяваліся, што хрушчоўскае пацяпленне і адліга стануць бясконцымі. Менавіта па гэтай прычыне іх творчасць выбудавалася ў непадзельны ланцуг «дзяржаўнае – пазадзяржаўнае – народнае». Адсюль сацыяльны і маральны аптымізм паэзіі пасляваеннага пакалення прыкладна двух дзесяцігоддзяў, веры ў пераадоленне, у ачышчэнне грамадства і сябе.

У 80-я гады гэты ланцуг пачне разрывацца, бо «у пазнейшыя гады, калі грамадска-палітычная сітуацыя змянілася, і змянілася не ў лепшы бок, тэндэнцыя праўды жыцця і шчырасці ў літаратуры захавалася, набыўшы больш шырокія вымярэнні і больш глыбінны характар» [1, с. 234]. На змену веры прыйдзе расчараванне, абвострыцца боль. Захочацца асвяжальнага ветру, «ветранасці» (зборнік А. Вярцінскага так і называўся «Ветрана»), нават больш, чым хацелася яе ў рамантычныя 60-я. Але вера не растрацілася канчаткова. «Пазадзяржаўнае» не перакрыла «дзяржаўнае». Гэта адбудзецца толькі ў 90-я гады (творы Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Н. Гілевіча, Я. Сіпакова). Канфрантацыя з ідэйным прыстасаванствам і фарысействам, як нам думаецца, палягае для гэтага пакалення па-ранейшаму ў межах маральна-этычных, а не сацыяльна-палітычных канфліктаў. А таму «пазадзяржаўнае» ўсё больш і больш набывае адзнакі агульначалавечага (казкі і метафары Я. Сіпакова; малітвы і прытчы Р. Барадуліна). Агульнавядома, што сфера маральных чалавечых адносінаў больш старадаўняя і вечная, чым сфера сацыяльна-палітычных. Маральна-этычнае – быць ці не быць чалавеку чалавекам? – пастуова становіцца галоўным змястоўным і формаўтваральным фактарам у паэзіі пасляваеннага пакалення. Яно – у абароне дабра і праўды, у барацьбе з сытасцю і двурушніцтвам, у пастаянных зваротах і Бураўкіна, і Барадуліна, і Вярцінскага, і Сіпакова да ваеннага мінулага, да памяці пра бацькоў, пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

матчыну хату, да першага снегу і пошуку высокага неба ідэалу.

Творчасць пасляваенцаў нязменна арыентавалася і арыентуецца на эпічнае, маштабнае асэнсаванне з'яў, на іх ацэнку ў цэлым, у разрэзе праблем гісторыі, часавай трохмернасці. Знаходзіцца месца ў іх лірыцы і медытатыўнасці, і прадметнасці, і майстэрству мастацкай дэталі, і вострым палітычным канфліктам, і асацыятыўнай вобразнасці. Можна гаварыць пра адначасовую эпічную шырыню і лірычную глыбіню падобнай паэзіі, якая спалучае вертыкальныя і гарызантальныя ракурсы пазнання рэчаіснасці, што выклікана, думаецца, «нацэленасцю» мастацкай творчасці беларусаў на дэмакратызм светаўспрымання, на народнасць ацэнкі падзей, на думку народную нават за кошт адмаўлення ад свайго, асабістага, ад эксперыментатарскага. Ва ўсе часы рэалістычная лірыка (беларуская асабліва) выказвала праўду пра рэальнае, а не ўяўнае жыццё, занатоўвала яго драбнейшыя рысы. Усё, што было звязана з рэальным жыццём народа-працаўніка, яна свята ўшаноўвала і берагла як найкаштоўнейшыя рэліквіі. Таму агульныя медытацыі і дэкларацыі ў абарону народа вырасталі ў першую чаргу на «канкрэтыцы», лірычнае перажыванне «апрадмечвалася».

Падобнаму патрыятычнаму пафасу адпавядаюць і жанравыя пошукі паэтаў-шасцідзесятнікаў: адкрытае прамаўленне дыктуе жанравая форма верша-звароту, пракламацыі, агіткі, заклiку (шмат такіх твораў у Бураўкіна і Вярцінскага). Аптымістычнаму настрою адпавядае і ода. Чыста адычны пафас пераплятаецца з элегічным. Бывае, што на яго праецыруецца і трагедыйнасць, уласцівая перш за ўсё баладнаму жанру. У пасляваенны час агульны жанравы «настрой» паэзіі Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Я. Сіпакова мяняўся – ад радасна-ўзнёслага, адычнага – да баладна-элегічнага, задаволенасць жыццём замяньвалася незадаволенасцю, пакутлівым і сурова-мужным прызнаннем неабходнасці непрымірымай барацьбы з фальсіфікатарамі гуманістычных ідэалаў. На жанравую змястоўнасць паэзіі паўплываў суб'ектыўны фактар: адзін паэт любіць пластычны малюнак, апісвае з'явы ў іх нерушнай свежасці (Р. Барадулін, ранні Я. Сіпакоў), другі схільны да адкрытага публіцыстычнага выказвання (Г. Бураўкін), для трэцяга галоўнае – павучанне і аналітызм (А. Вярцінскі). Адсюль таксама вынікае і разнастайнасць жанравых пошукаў, захапленне лірыкай ці чыста медытатыўнай, ці медытатыўна-выяўленчай, ці апісальна-выяўленчай, ці эталагічнай, ці палітычнай і інш.

Дзякуючы вылучэнню маральна-этычнай, выхаваўчай змястоўнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лірыка становіцца з'явай надзвычай цэласнай: паэты ствараюць такі мастацкі свет, у цэнтры якога чалавек-мысліцель, філосаф, палітык, публіцыст, грамадзянін, які клапоціцца пра зямны лёс. Адзначым, што гэта творчасць розных індывідуальнасцей: у А. Вярцінскага эталагічная аснова ляжыць на паверхні, у Р. Барадуліна і Я. Сіпакова аздоблена яркімі пластычнымі малюнкамі, трапнай апісальнасцю, у П. Макаля ў большай ступені чым у А. Вярцінскага падмацоўваецца асацыятыўнасцю. Гэтыя паэты актыўна выконваюць агульную мэту – служаць духоўнаму ачышчэнню чалавецтва.

Паэзія яркага прадстаўніка філалагічнага пакалення Я. Сіпакова 50–70-х гадоў арганізуецца ў цэласнасць (найперш змястоўную) вобразамі-архетыпамі светлай афарбоўкі, у ліку якіх Сонца, Поўдзень, Дзень. Невыпадкова і кнігі ранняга Сіпакова называліся характарыстычна, канцэптуальна: «Дзень», «У поўдзень, да вады...». Пазней чорны колер паступова пачынае выцясняць светлы, з'явіцца вобраз-архетып Змроку, які канкрэтызуецца праз сінонімы Ноч, Боль. І кнігі будуць ужо называцца іначай: «Вочы ў вочы», «Ахвярны двор». З'явіцца і злавесны вобраз Чорнага болю – Чарнобылю. Такая палярызацыя зместу абумовіла і многія іншыя кампаненты яго творчасці. Паэтыку жанраў: ода, гімн, урачысты верш – на адным полюсе, балада, элегія-плач, прытча – на другім. Паэтыку рытмікі і інтанацыі: лёгкая, мажорная, даволі аднамерная – пачатку творчасці, ускладненая, абцяжараная паўзамі, інверсіямі – у пазнейшы перыяд. Гармонія памянялася на кантрастнасць ва ўсім: і ў галоўным, істотным, агульным, і ў малым, канкрэтным.

Такім чынам, пакаленне шасцідзесятнікаў унесла ў літаратурны працэс агульначалавечыя каштоўнасці, у значнай ступені праігнараваныя ў перадваенныя гады, стварыла цэласную жанрава-стылявую сістэму, «замкнёную» вобразамі-сімваламі «вера», «вернасць», «давер», згарманізаваную ў еднасць грамадзянскай экзальтацыяй, сінтэзам высокага адычнага і трагедыйнага, сентыментальнага баладнага і элегічнага настрояў, павышанай эмацыянальнасцю. Аднак у 80-я гады мастацкая сістэма, у якую сцягнуліся ўсе вектары творчасці пакалення шасцідзесятнікаў распалася ў выніку выключэння з яе галоўнага звяна – ідэалагічных арыенціраў, упэўненасці ў дасягненні пазітыўных вынікаў, што прывяло да жанравых (ода, гімн, рамантычная замалёўка – элегія, верш-скарга, жальба, медытацыя – ода-абвяржэнне, пратэст, малітва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прытча, метафара), пафасных (радасць, вера ў будучыню – расчараванне – зняверанасць) і вобразных (гарманічная карціна – псіхалагізаваная карціна-сінтэз малюнкавасці і філасофскіх сентэнцый – асацыятыўная вобразнасць, сінтэз малюнкавасці і абагуленасці) эвалюцыйных зменаў у іх творчасці.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Андраюк С. Сфармавана атмасферай часу / С. Андраюк // Крыніца. – 2001. – № 11 –12.
2. Арочка М.М. Беларуская савецкая паэма / М.М. Арочка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979.
3. Вайль П., Генис А. Страна слов /П. Вайль, А. Генис // Новый мир. – 1991. – № 4. – С.243 –250.
4. Вярцінскі А. Высокае неба ідэала: Літ. крытыка і публіцыстыка. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 333 с.
5. Тычына М. Асцярожна: гняздо жаўранка! // Полымя. – 1984. – № 4.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ